# «ДОБРАСУСЕДСТВА-2009» РАССТАЎЛЯЕ АКЦЭНТЫ

Вельмі насычанай атрымалася праграма XIII Эканамічнага беларуска-польскага форуму «Добрасуседства-2009», які прайшоў у польскім горадзе Седльцэ пад эгідай Польска-Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. Усіх прысутных у Галоўнай аўдыторыі Падляскай акадэміі польскіх і беларускіх прадпрымальнікаў хвалявала пытанне: у якой меры глабальны эканамічны крызіс адбіўся на гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве Беларусі і Польшчы? І што трэба змяніць бакам у забеспячэнні ўзаемнага доступу да сваіх рынкаў, каб мінімізаваць наступствы не зусім спрыяльных знешніх умоў? На гэтыя і цэлы шэраг іншых пытанняў спрабавалі знайсці адказы больш як 200 удзельнікаў «Добрасуседства-2009».

— У гэтым годзе мы прагназуем зніжэнне тавараабароту паміж нашымі краінамі прыблізна на трыццаць працэнтаў, — сказаў, распачынаючы форум, старшыня Польска-Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Юзэф Лахоўскі. — Тым не менш мы з аптымізмам глядзім у будучыню польска-беларускага дзелавога супрацоўніцтва. У Беларусі адбываюцца сур'ёзныя змяненні ў эканоміцы, узяты курс на мадэрнізацыю. Мы бачым, што ў польскага капіталу з'яўляюцца добрыя перспектывы прыйсці ў Беларусь, дзе адкрываюцца новыя магчымасці інвеставання, напрыклад, у малых і сярэдніх гарадах. Дадатковы імпульс нашаму супрацоўніцтву можа надаць праграма Еўрапейскага саюза «Усходняе партнёрства», у рамках якой беларускі бок ужо прапануе некалькі буйных праектаў. Цікавым можа атрымацца наша ўзаемадзеянне ў галіне грузавога аўтамабільнага і чыгуначнага транспарту.

— Форум «Добрасуседства-2009» — гэта каштоўная ініцыятыва, якая, як правіла, прыводзіць да канкрэтных вынікаў, — адзначыла намеснік міністра эканомікі Польшчы Гражына Ханцлеўска. — Шмат пра што гаворыць такая лічба: цяпер з беларускім бокам супрацоўнічае больш як пяць тысяч польскіх фірмаў. Мы заўважаем адкрыты падыход да гэтага ўзаемадзеяння і партнёраў з Беларусі, дзе ствараецца добры клімат для інвестыцый. Перспектыўнымі галінамі польска-беларускага інвестыцыйнага супрацоўніцтва, на наш погляд, з'яўляюцца сёння галіны будаўнічых матэрыялаў, упакоўкі, банкаўскі сектар, лагістыка, турызм. Інакш кажучы, гаворка ідзе пра найважнейшыя галіны беларускай эканомікі, у якія можа прыйсці польскі капітал. Безумоўна, мы цудоўна разумеем, што яшчэ шмат чаго трэба зрабіць па вырашэнні праблем мяжы, па актывізацыі дыялогу польскіх і беларускіх мытных і памежных службаў, а таксама па стымуляванні прадпрымальніцтва на карысць паляпшэння ўмоў вядзення бізнэсу на знешніх рынках. Але ў найбліжэйшую будучыню мы глядзім з аптымізмам, бо перакананыя: развіццё эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі будзе стабілізавальным фактарам у адносінах Польшчы і Беларусі. Наша найбліжэйшая мэта — стварыць максімальна зручныя ўмовы для супрацоўніцтва прадпрымальнікаў і бізнэсменаў нашых краін.

Усяго за два дні работы эканамічнага форуму «Добрасуседства-2009» у польскім горадзе Седльцэ на яго пленарных і секцыйных пасяджэннях са сваімі прапановамі па ўдасканальванні беларуска-польскага дзелавога ўзаемадзеяння выступіла больш за шэсцьдзясят чалавек — бізнэсменаў, прадстаўнікоў дзяржаўных і галіновых органаў і ведамстваў абедзвюх краін. Такая актыўнасць азначае толькі адно: глабальныя крызісы прыходзяць і сыходзяць, а эфектыўнае супрацоўніцтва Беларусі і Польшчы будзе толькі развівацца.

**Барыс ЗАЛЕСКІ.**

*Седльцэ — Мінск.*




**LUCKY UNION FOODS — EURO**

Производитель охлажденных и замороженных палочек, соломки и других изделий на основе рыбного фарша **приглашает к сотрудничеству.**

NIP: PL8561738954.

**КОНТАКТ:**
**«LUF-EURO» Sp. z o.o. Lozienica, ul. Nowa 7. 72-100 Goleniow. Poland/Польша.**
**Тел.: + 48 91 419 42 22.**
**Факс: + 48 91 419 42 30.**
**E-mail: marketing@luf-euro.pl**

ALLEGRO-EKO

**ДЕЗИНФЕКЦИЯ ПОВЕРХНОСТЕЙ, контактирующих с пищевыми продуктами**

Производим моюще-дезинфицирующее средство **ДЕЗИНФЕКТОЛ-Б** из импортированных из США четвертичных солей аммония высшего качества.
**Защита от микробов** — 99,99 %.
**Цена за 1 литр препарата** — 2,5 евро.
**Концентрация (0,5 %)** — 50 мл на 10 литров воды (1 литра концентрата достаточно для 200 литров рабочей жидкости).
**Тип упаковки** — ПЭТ емкостью 1, 5, 10, 200 и 1000 литров.

NIP: PL6991852077.

**«ALLEGRO-EKO» Sp. z o.o.**
**ul. Fabryczna 6, 63-910 Miejska Gorka, Polska/Польша.**
**Факс: + 48 65 547 56 55. Тел. моб.: + 48 608 527 166.**
**E-mail: biuro@allegro-eko.pl www.allegro-eko.pl**

**ВЫРАЩИВАЕМ ФРУКТЫ И ОВОЩИ**

NASZ OWOC sp. z o.o.
GRUPA PRODUCENTÓW OWOCÓW I WARZYW

Готовы установить сотрудничество с оптовыми организациями в Беларуси для поставок
**ЯБЛОК, ПЕКИНСКОЙ КАПУСТЫ, А ТАКЖЕ ДРУГИХ ОВОЩЕЙ.**

**Контакт:**
**ul.Latkow 11, 26-910 Magnuszew, Polska/Польша.**
**Тел./факс: + 48 48 621 76 58. Тел.моб.: + 48 697 424 321.**
**E-mail: biuro@naszowoc.pl.**

NIP: PL8121833393.

**ФИРМА «MIPAMA IMPORT-EXPORT» ИЗ ПОЛЬШИ ПРЕДЛАГАЕТ:**

mipama EXPORT IMPORT

- **СУШЕНЫЕ ОВОЩИ** (пастернак, морковь, лук, петрушку NAC);
- **ТРАВЫ** (шалфей, тархун, чабрец, тмин);
- **ЗЕРНОВЫЕ** (фасоль, гречку);
- **ОВОЩИ, КОНСЕРВИРОВАННЫЕ В РАССОЛЕ** (лук, огурцы, перец, чеснок, спаржа и многое другое).

**Упаковка — для промышленности и отдельных лиц.**

**ПРИГЛАШАЕМ К СОТРУДНИЧЕСТВУ!**

Дополнительная информация — на нашем сайте:
**www.mipama.pl**
Тел.: **+ 48 62 767 04 75.** Факс: **+ 48 62 767 04 77.**
**E-mail: mipama@mipama.pl,** г. Опалувек, Польша.

NIP: PL9680878320